Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 45 (5173)
ЛЮТЫ
26
АЎТОРАК
1935 г.
год выдання XVIII

*Друк — адзіная зброя, пры дапамозе якой партыя штодзенна, штогадзінна гаворыць з рабочым класам на сваёй, патрэбнай ёй мове. Іншых сродкаў працягнуць духоўныя ніці паміж партыяй і класам, іншага такога гібкага апарата ў прыродзе няма.* (СТАЛІН)

# АДКРЫЎСЯ III УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД РАБСЕЛЬКОРАЎ

## ЦК ВКП(б) — тав. СТАЛІНУ

Дарагі і горача любімы Іосіф Вісарыёнавіч!

Першая мысль і першае слова наша, ударнікаў большэвіцкага друку, удзельнікаў III Усебеларускага з'езда рабселькораў, накіроўваюцца табе — вялікаму праваднырю ўсіх працоўных Советскага Саюза і прыгнечаных усяго свету, табе — мудраму і праворліваму кіраўніку, вядучаму вялікую краіну Советаў ад перамогі да перамогі.

Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі сабраў нас, рабселькораў, для вывучэння і абмеркавання вынікаў VII усесаюзнага з'езда советаў і II-га з'езда калгаснікаў-ударнікаў, у рашэннях якіх увасоблены вялікія сталінскія задачы работы ўсёй краіны, большэвіцкага друку і арміі рабселькораў. Гэтыя рашэнні будуць праграмай і сцягам нашай далейшай барацьбы, пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, за ажыццяўленне задач другой пяцігодкі, пяцігодкі пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Контррэволюцыйныя паследышы антысовецкай зіноўеўскай групы, якія самкнуліся з белагвардзейшчынай і фашыстамі, вырвалі з нашых радоў любімца ўсёй партыі і працоўных, аднаго з лепшых ленінцаў, друга і саратніка таварыша Сталіна — Сергея Міронавіча Кірава. У адказ на гэты гнусны выстрал працоўныя Советскай Беларусі яшчэ цясней згуртаваліся вакол цябе, наш родны вялікі Сталін, вакол сталінскага ЦК, вакол большэвіцкай партыі, з жалезнай рашучасцю, бязлітасна і да канца выкарчаваць астаткі класавага ворага, прабуючыя ў бяссільнай злобе затармазіць наш пераможны рух да соцыялізма.

Ад імя 50-тысячнай арміі камандзіраў пролетарскай грамадскай думкі Советскай Беларусі клянемся, што мы гатовы па першаму зову партыі і ўрада са зброяй у руках абараняць нашу кроўную справу соцыялістычнага будаўніцтва, за якую мы беззаветна змагаліся, змагаемся і будзем змагацца ў інтарэсах працоўных і прыгнечаных усяго свету.

Няхай жыве наша большэвіцкая партыя!

Няхай жыве сталінскі ЦК!

Няхай жыве наш родны, наш любімы вялікі **Сталін!**

## ДЗЕННІК З'ЕЗДА



У прэзідыуме з'езда. Злева направа: тт. КАРТУКОЎ, ГУРВІЧ (рабочы завода «Чырвоны октябр», Мозыр), ЧАРВЯКОЎ, ЛЕЙЗЕР, ІВАНОЎ.

## Уступная прамова тав. Картукова

Таварышы, з часу II-га ўсебеларускага з'езда рабселькораў прайшло каля 4-х год. У гэты параўнальна невялікі тэрмін рабочы клас, пад кіраўніцтвам нашай слаўнай комуністычнай партыі, яе ленінскага ЦК, на чале з вялікім **Сталіным** дабіўся гістарычных перамог па соцыялістычнай перабудове горада і вёскі. Зараз фунда-



VII з'езда советаў Саюза, XI з'езда советаў Беларусі — вось наша баявая праграма далейшай барацьбы за пабудову бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Мы павінны даць працоўным больш і лепшай якасці прадукцыю. Рабочы і калгаснік зараз лепш жывуць і таму хочуць мець

## ГАНАРОВЫ ПРЭЗІДЫУМ

СТАЛІН,
МОЛАТАЎ,
КАГАНОВІЧ,
КАЛІНІН,
ВАРАШЫЛАЎ,
АНДРЭЕЎ,
КАСІОР,
ОРДЖАНІКІДЗЕ,
РУДЗУТАК,
ЧУБАР,
МІКАЯН,
ПЕТРОЎСКІ,
ЖДАНАЎ,
ПОСТЫШЭЎ,
ГІКАЛО,
ГАЛАДЗЕД,
ЧАРВЯКОЎ,
ТЭЛЬМАН,
ГОРКІ,
ЛЕНСКІ.

## ПРЭЗІДЫУМ III УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА

